У гэтай казцы рэдагаванне змяніла некалькі сітуацый. Так, Чарапаха пасля паўтора песні жабак не пяе за імі. Калі б гэта не было выкінута, то мала ўзнікнуць пытанне, чаму гэта жабкі ўжо тады не зразумелі, што ў Чарапахі сапраўды няма голасу. Таксама выкінут момант, дзе Чарапаха адказвае на то, што яе назвалі танкам.

У слове "Насмешніца" вялікая літара змянілася на маленькую, бо здзекаваліся з Чарапахі ўсе жабы, таму не трэба вылучаць адну.

Каб не было непаразуменняў, фраза "Голосу няма…" была зменена на "А ў цябе голасу няма…". Сапраўды, у першым варыянце здавалася, што гэта жабкі пра сябе гавораць, у іх голасу няма.

Астатнія праўкі ў большасці робяць мову пісьменніка літаратурнай.

Такім чынам, сур'ёзных правак у казкі У. Караткевіча не ўнасілі, большасць з іх рабілася для прывядзення тэксту да літаратурнаймовы. Часцей за ўсё праўкі-скарачэнні прымяняліся да твораў, якія былі ўпершыню апублікаваны ў часопісе "Бярозка".

ЛИТЕРАТУРА

1 Караткевіч, У. С. Збор твораў. У 25 т. Т. 3. Апавяданні. Казкі: 1946-1981 / Уладзімір Караткевіч, падрыхт. тэкстаў і камент. Анатоля Вераб'я; рэд. тома Таццяна Шамякіна. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. — 774 с.

2 Лихачев, Д. С. Текстология: краткий очерк. — М.: Наука, 2006. — 175 с.

3 Золава, Э. А. Тэксталогія — мая прафесія. З вопыту падрыхтоўкі да выдання збораў твораў классікаў беларускай літаратуры. — Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2006. — 164 с.

УДК 821.161.3.09

Студ. К. С. Колб
Навук. кір. дац. В. У. Токар
(кафедра редакционно-издательских технологий, БГТУ)

## НЕКАТОРЫЯ ВІДЫ ВЫДАННЯЎ К. ЧОРНАГА

Кузьма Чорны яшчэ толькі пачынаў, а крытыка яго ўжо ахрысціла «беларускім Дастаеўскім». Сам ён добра ведаў цану такім азначэнням, бо для таго, каб стаць «Дастаеўскім», трэба было перш за ўсё стаць беларускім пісьменнікам, выявіць у сваёй творчасці нацыянальны характар беларуса, стварыць беларускі раман, беларускі стыль. Кузьма Чорны – выдатны знаўца народнай гаворкі. Ён

ўзбагаціў нацыянальную прозу творамі, у якіх узноўлены шырокія карціны рэчаіснасці, створаны шматстайныя чалавечыя характары, пастаўлены вострыя праблемы часу, зроблены глыбокія філасофскія абагульненні. Зборнікі яго твораў выдаваліся, выдаюцца і будуць выдавацца [1].

У якасці аб'екта вывучэння былі абраныя два віды выдання (збор твораў, выбраныя творы) пісьменніка-класіка Кузьмы Чорнага.

Самым старым, што ўдалося знайсці ў фондах НБ Беларусі, з'яўляецца выданне Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі ЛіМ **"Выбраныя творы" (1934 г.)**. Навукова-даведачны апарат прадстаўлены толькі зместам. Адстутнічае ў кнізе і анатацыя. У зборніках, выдадзенных пазней, часта можна знайсці адсылку менавіта на гэтае выданне. Кніга уваходзіць у "Школьную серыю".

У **1947** тодзе у Дзяржаўным выдавецтве БССР пабачыла свет яшчэ яшчэ адна кніга Кузьмы Чорнага **"Выбраныя творы"** пад рэдакцыяй М. Клімковіча. Прадмову пад назвай "Выдатны беларускі празаік" склаў Уладзімір Карпаў. Яна ўяўляе сабой артыкул з літаратурна-крытычнай ацэнкай творчасці пісменніка і менавіта твораў, якія уваходзяць у зборнік. Маецца у выданні указальнік кніг Кузьмы Чорнага, якія выйшлі да моманту выдання кнігі.

Наступным выданнем **К. Чорнага з'яўляецца Збор твораў у 6 тамах (1954-1955 гг.)**. У рэдакцыйную калегію уваходзілі Я. Колас, К. Крапіва, У. Карпай, І. Кудраўцоў (аўтар прадмовы да зборніка). Навукова-даведачны апарат нескладаны. Акрамя зместа і прадмовы, туды уваходзяць Заувагі (каментарыі), дзе адзначана першая публікацыя кожнага з твораў. Гэты зборнік з'яўляецца першай спробай стварыць выверанае і дакладнае выданне твораў К. Чорнага.

**Збор твораў Кузьмы Чорнага ў васьмі тамах (1972-1975 г.)** – першае навуковае выданне спадчыны выдатнага беларускага празаіка. У яго ўключаны амаль усе вядомыя творы пісьменніка і размеркаваны па тамах у храналагічнай паслядоўнасці наступным чынам: 1 – апавяданні 1923–1927 гг.; 2 – апавяданні 1928–1944 гг.; 3 – раманы «Сястра», «Зямля»; 4 – аповесці «Лявон Бушмар», «Вясна», «Ідзі, ідзі» і раман «Бацькаўшчына»; 5 – апавяданне «Насцечка», аповесць «Люба Лук'янская» і раман «Трэцяе пакаленне»; 6 – аповесць «Скіц'ёўскі лес» і раманы «Пошукі будучыні», «Млечны Шлях», «Вялікі дзень»; 7 – драматычныя творы: «Не пішы чорт ведае як», «3 драмы» (урывак), «Вызваленне» (пралог да п'есы), «Лета», «Бацькаўшчына», «Аксеня Чадавецкая» (няскончаныя драма), «Базылевічава сям'я», «Ірынка»; няскончаныя раманы: «Вецер і пыл», «Трыццаць год», «Заваёва све-

ту», «Захаду і ўсходу», «Судны дзень»; 8 – публіцыстычныя творы, летапіс жыцця і творчасці Кузьмы Чорнага, алфавітны паказчык твораў, паказчык імён. Гэтае выданне з’яўляецца найбольш поўным і дакладным ў тэксталагічных адносінах. у зборнік уклячаны многія публіцыстычныя і крытычныя артыкулы.

Крыніцай асноўнага тэксту з’яўляюцца апошнія прыжыццёвыя зборнікі пісьменніка. Калі ж твор не ўваходзіў у зборнікі, ён даецца па першадруку або па рукапісе. Акрамя зместа зборнік мае алфавітны даведнік [2].

Прадмова напісана Алесем Адамовічам. Яна падзелена на 3 часткі, кожная з якіх пачынаецца эпіграфам (цытата з твора Кузьмы Чорнага).

У каментарыях даюцца літаратурна-тэксталагічныя звесткі, тлумачэнні незразумелых слоў, прыводзяцца варыянты тэкстаў, а для некаторых твораў і іншыя рэдакцыі. Падрыхтоўка Збору твораў Кузьмы Чорнага ў 8 тамах ажыццёулена пад навуковым кіраўніцтвам акадэміка АН БССР В. В. Барысенкі і дотара філалагічных навук Ю. С. Пшыркова [3].

**Збор твораў К. Чорнага ў 6 тамах** выдала “Мастацкая літаратура” у **1988-1992 гг.**. У рэдакцыйную калегію уваходзілі С. Андраюк, В. Вітка, М. Мушынскі, М. Стральцоў. Каментарыі і тэксты рыхтавалі А. Рагуля і Р. Раманоўская. Прадмову “Чалавек – гэта цэлы свет” (мае 8 частак) склаў М. Стральцоў.

У першы том увайшлі апавяданні і публіцыстыка 20-х гадоў. Большасць мастацкіх твораў публікавалася у першых зборніках празаіка: “Апавяданні” (1925), “Срэбра жыцця” (1925), “Вераснёвыя ночы” (1929).

Кніга Кузьмы Чорнага **«Выбраныя творы» (2000 г.)** падрыхтавана міжнародным грамадскім аб’яднаннем «Беларускі кнігазбор» і выдадзена на заказ аб’яднання ў серыі «Беларускі кнігазбор». У аднатомнік класіка беларускай літаратуры ўвайшлі самыя значныя яго творы – раманы, аповесці, апавяданні, узоры публіцыстыкі і (у поўным, без скарачэнняў, выглядзе) дзённік, які вёў пісьменнік у канцы жыцця. Гэта – адзінаццаты том «Беларускага кнігазбору».

Навукова-даведачны апарат даволі развіты. Прадмова “Цана прароцтваў” напісана Міхасём Тычынай. Гэта артыкул біяграфічнага характару.

Асноўнай тэксталагічнай крыніцай пры складанні аднатомніка паслужыў найбольш поўны і найбольш дакладна выверاны Збор

твораў Кузьмы Чорнага ў 8-і тамах (1972–1975). Што да «Дзённіка» празаіка, то ён публікуецца па часопісе «Полымя» (1988, № 4), дзе ўпершыню прадстаўлены ў аўтэнтычным выглядзе. Яшчэ частка твораў надрукавана па аўтографах, захоўваюцца ў сямейным архіве пісьменніка, а таксама ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Каментар да яго склалі М.Тычына і Я.Янушкевіч; да астатніх раздзелаў – М.Тычына. У каментарнай частцы дзённіка выкарыстаны заўвагі і парады Янкі Брыля, Генадзя Кісялёва, Уладзіміра Ляхоўскага, Анатоля Сабалеўскага і іншых значных дзеячаў беларускай літаратуры.

Як бачым, творчая спадчына К. Чорнага не абдзелена ўвагай даследчыкаў. Аднак калі ў апошнія дзесяцігоддзі былі выдадзены новыя зборы твораў беларускіх пісьменнікаў-класікаў (напрыклад, Я. Купалы, Я. Коласа, У. Караткевіча і інш.) з улікам новых тэксталагічных даследаванняў, то спадчына К. Чорнага яшчэ чакае свайго выдаўца.

ЛІТАРАТУРА

1 Лихачев, Д. С. Текстология: краткий очерк. — М.: Наука, 2006. — 175 с.

2. Золава, Э. А. Тэксталогія — мая прафесія. З вопыту падрыхтоўкі да выдання збораў твораў классікаў беларускай літаратуры. — Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2006. — 164 с.

3 Томашевский Б. В. Писатель и книга. Очерк текстологии. – М., 1959. — 279 с.

УДК 821.161.3.09

Студ. Д. А. Значёнок
Науч. рук. доц. О. В. Токарь
(кафедра редакционно-издательских технологий, БГТУ)

## ОБЗОР ИЗДАНИЙ ИЗБРАННЫХ ПРОИЗВЕДЕНИЙ ЯКУБА КОЛАСА

Культура и уровень изданий произведений писателей-классиков является неотъемлемой частью национальной культуры в целом, так как говорит о востребованности обществом их творческого наследия, а также об уровне его филологического и текстологического исследования.

Цель работы – выявить издания избранных произведений Я. Коласа и дать им краткую оценку.